

ПАЖАР
У ЗОНЕ
АДЧУЖЭННЯ

3



КАЛІ
АНТЫСЕПТЫК
СУШЫЦЬ РУКІ...

6

15 КРАСАВІКА 2020 г. СЕРАДА

№ 73 (29187)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Разам мы можам зрабіць больш»



Фота БелТА.

**У фармаце відэаканферэнцыі гутарка лідараў пяцёркі ЕАЭС праходзіла ўпершыню. Рабочую сустрэчу ў незвычайнай форме ініцыяваў старшыня Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Нагода для размовы надзвычайная — як разам будзем супрацьстаяць пандэміі і забяспечваць эканамічную стабільнасць у Еўразійскім эканамічным саюзе. З такім пасылам кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуўся да сваіх калег: прэзідэнтаў Расіі, Казахстана, Кыргызстана і прэм'ер-міністра Арменіі.**

## Згуртаванасць і рашучасць — лекі для эканомікі

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе краіны сур'ёзна паставіліся да пандэміі і кожная выпрацоўвае свае формы рэагавання на праблему.

*«**Але разам мы можам зрабіць больш**.* Сведчаннем гэтаму з'яўляецца вопыт нашай мінулай работы і вопыт, які назапасілі на працягу двух-трох месяцаў нашага існавання ў гэтай сітуацыі», — дадаў ён.

Прадмет гутаркі, прапанаванай нашым Прэзідэнтам, — забеспячэнне стабільнасці і спакою ў грамадстве, недапушчэнне размывання асноў саюза з-за імкнення ў першую чаргу засцерагчы толькі сябе.

*«**Калі мы не аб'яднаем намаганні, то заўтра будзем аднаўляць парушаныя эканамічныя сувязі. І на гэта пойдзе шмат часу, шмат грошай і шмат працы**.* Тое, што цяпер адбываецца ў свеце, пацвярджае выказаныя асцярогі. Вірус разбурае жыцці і сем'і, уносіць сумятню ў работу рынкаў, прыводзіць да спынення цэлых галін, сур'ёзна ўплывае на стан спраў у нафтавай сферы. Аднабаковыя дзеянні дзяржаў паставілі пад пагрозу гандлёвыя адносіны, кааперацыйныя ланцужкі, працоўную міграцыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Дадаткова пагаршае гэтыя негатыўныя фактары і адсутнасць каардынацыі намаганняў. Як падкрэсліў кіраўнік нашай краіны, эгаістычныя рашэнні, што прымаюцца без аглядкі на наступствы як мінімум у дачыненні да найбліжэйшых партнёраў, не будуць мець поспеху. ***Толькі дзякуючы згуртаванасці і рашучасці саюзнікі змогуць справіцца з пандэміяй і яе наступствамі.***

Еўразійская эканамічная камісія ініцыявала шэраг першачарговых мер. Але яны не ахопліваюць усяго комплексу неабходных дзеянняў, каб максімальна выкарыстоўваць патэнцыял ЕАЭС.

У кожнай краіне ўжо прымяняюцца эфектыўныя практыкі па забеспячэнні бяспекі жыцця, здароўя людзей і падтрымцы нацыянальных эканомік. Пасля беларускага Прэзідэнта пра іх расказаў кожны з лідараў краін ЕАЭС.

Прэзідэнт Беларусі запэўніў калег, што ў Беларусі прымаюцца неабходныя меры па прадухіленні распаўсюджвання ўсякіх інфекцый: ***«Гэтыя меры цалкам адпавядаюць патрабаванням і нормам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, эксперты якой некалькі дзён таму пакінулі Беларусь, прапрацаваўшы тут тыдзень па маім запрашэнні.*** Нягледзячы на тое, што мы не закрылі граніцу, у дачыненні да ўсіх, хто ўязджае, ажыццяўляюцца мерапрыемствы санітарна-каранціннага характару. Сітуацыя з захваральнасцю пастаянна адсочваецца і даводзіцца да грамадскасці».

СТАР. 2

# Красуні ў чырвоным на чырвоных аўто



Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БелТА.

Юныя жыхаркі пасёлка Сапоцкін Гродзенскага раёна.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Віталь ПАЛЯНІН, дырэктар праекта па ўзвядзенні Беларускай АЭС:**

*«Мы паспяхова завяршылі этап гарачай абкаткі — адзін з найважнейшых і самы маштабны ў падрыхтоўцы атамнага аб'екта да ўводу ў эксплуатацыю, выканалі ўвесь неабходны аб'ём выпрабаванняў на намінальных параметрах рэактарнай устаноўкі, а таксама ў перыяд яе разагрэву і расхалоджвання. Выпрабаванні паказалі, што ўсё абсталяванне і тэхналагічныя сістэмы энергаблока, задзейнічаныя ў праграме выпрабаванняў, адпавядаюць праектным характарыстыкам».*

Дарогамі Славы

# «Ой, бярозы ды сосны, партызанскія сёстры...»

75 Вялікая Перамога

**З усіх беларускіх поўных кавалераў ордэна Славы, з якімі мне пашчасціла пазнаёміцца, гэтыя двое былі леснікамі — простая, цяжкая, незайздросная прафесія вартавога лесу, якой франтавікі прысвяцілі пасляваеннае жыццё. Напэўна, і вайна, і лес, у якім яны працавалі, былі для іх наканаваннем — жорсткім і ў той жа час міласэрным лёсам: яны ваявалі спраўна, біліся да апошняга, а як здабылі Перамогу, садзілі і даглядалі дрэвы. Вынікі гэтай справы — сотні гектараў спелага і спеўнага бору, які і па сёння красуе і кранае.**

**У іхніх лёсах было шмат падобнага. Акрамя лясной прафесіі, абодва былі ўдзельнікамі партызанскага руху — у лесе і пачыналася іх баявая біяграфія. І па ўзросце былі амаль аднагодкі, нават імя мелі адно на дваіх — Аляксандр. Але Аляксандр Кастрама жыў на Гомельшчыне, у Рэчыцкім раёне, ахоўваў і пеставаў лес каля вёскі Салтаноў, а Аляксандр Малевіч — жыхар Брэстчыны, яго лясныя абшары знаходзіліся каля вёскі Ліпск Ганцавіцкага раёна. У жыцці ветэраны ніколі не бачыліся, хоць, магчыма, і чулі адзін пра аднаго: вядома, працавалі ў адным ведамстве. Дарэчы, з поўных кавалераў ордэна Славы ў лясной гаспадарцы працавалі шэсць чалавек: акрамя Кастрамы і Малевіча, з лесам звязалі сваё жыццё Міхаіл Рагоўскі з Любанскага раёна, Павел Рубіс з Расонскага, Уладзімір Маджар з Калінкавіцкага і Аляксандр Васільеў, які жыў у Томскай вобласці Расіі, — пра ўсіх іх мы раскажам у наступных публікацыях.**



СТАР. 3

Свая справа

# ШАНАВАЦЬ ПРОСТЫЯ РЭЧЫ

**Сёння зразумелае жаданне людзей выходзіць у краму як мага радзей, у тым ліку па прадукты першай неабходнасці. Многія ў гэты час вырашаюць, што менавіта цяпер атрымалі выдатны стымул навучыцца пячы хлеб самастойна. Асабліва папулярныя боханы на заквасцы. Пачаць карміць сваіх дамачадцаў смачным і карысным хлебам, асвоіць новую для сябе прафесію, якая ў далейшым зможа прынесці заробак... Чаму б і не?**

**Вольга БАХМЕТАВА, жыхарка пасёлка Чонкі, што пад Гомелем, — куратар міжнароднай анлайн-школы хлеба на заквасцы, у якой вучыцца больш за дзве тысячы рускамоўных вучняў з 40 краін свету, — пацвярджае: ёсць усплёск цікавасці да хлебнай справы. Яна ўпэўнена, што дамашні каравай — гэта пра каштоўнасць простых рэчаў і пра вяртанне да «каранёў жыцця».**



Дом з бярвення на ўскраіне Чонак сужэнцы Бахметавы называюць «шпаковенкай». Маўляў, сапраўдныя гаспадары — птушкі, што аблюбавалі ўсю верхнюю частку зруба. Птушыны гоман напаўняе дом. Але калі трапляеш унутр абжытай сямейнай прасторы, разумееш, што насамрэч вабіць птушак. Так, незвычайны водар. Хлебным духам запаўняе прастору Вольга Бахметава. Жартуе, што тры гады таму перажыла прафесійную рэінкарнацыю: у мінулым жыцці яна — юрыст з амаль 20-гадовым стажам. Новае жыццё падарыў хлеб.

СТАР. 8

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еўрапейскія краіны паступова выходзяць з каранціну



Нягледзячы на складаную агульнасусветную сітуацыю з каранавірусам, найбольш пацярпелыя ад эпідэміі Іспанія і Італія паступова здымаюць абмежаванні, уведзеныя ў спробе спыніць распаўсюджванне хваробы. Урад Іспаніі прыняў адпаведнае рашэнне. Але каталонскія ўлады ўжо адмовіліся яго выконваць: кіраўнік рэгіянальнай адміністрацыі Каталоніі Кім Торэ заявіў, што рызыка новай успышкі і другога каранціну занадта вялікія. Аднак у астатніх рэгіёнах краіны рабочыя, занятыя на вытворчасці, будаўнікі і шэраг іншых катэгорый грамадзян змогуць вярнуцца да работы пры захаванні строгіх санітарных нормаў. У Італіі рэжым усеагульнай ізаляцыі працягнуты, але апроч харчовых, адкрыліся кніжныя крамы, крамы канцылярскіх тавараў і дзіцячага адзення. Аб адкрыцці школ і частковым зняцці абмежаванняў на перамяшчэнне грамадзян раней абвясціла Данія — адна з першых краін Еўропы, дзе яны былі ўведзены. У Германіі ўрад абмяркоўвае змякчэнне мер, а ў Францыі і Вялікабрытаніі ўсе абмежаванні застаюцца. Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон аб'явіў у звароце да нацыі аб прадаўжэнні каранціну амаль на месяц — да 11 мая.

## Apple і Google запускаюць глабальны праект

Кампаніі Apple і Google абвясцілі сумесны праект. У яго рамках у аперацыйныя сістэмы iOS і Android, якія ім належаць, будзе ўкаранёна спецыяльнае праграмнае забеспячэнне. Яно папярэдзіць карыстальнікаў аб магчымым кантакце з заражаным новым каранавірусам, паведамляе The New York Times. Такую сістэму створаць у найбліжэйшыя месяцы. Электронныя прылады будуць фіксаваць сігналы ад іншых гаджэтаў, якія знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад уладальніка, і паведамляць яму аб набліжэнні да інфіцыраванага COVID-2019. Органы аховы здароўя розных краін адзіныя ў меркаванні, што прасунутая сістэма адсочвання заражаных і ўсіх, хто з імі кантактаваў, можа дапамагчы ў запаволенні тэмпаў пандэміі. Тым не менш аб'яднанне двух IT-гігантаў, якія ў «мірны час» з'яўляюцца канкурэнтамі, выклікае шмат пытанняў, якія датычацца прыватнасці карыстальнікаў.



## У Нідэрландах знішчылі 400 мільёнаў кветак



У тым ліку больш за 140 мільёнаў славутых галандскіх цюльпанаў. На такія меры давялося пайсці з-за зніжэння попыту на кветкі ва ўмовах пандэміі каранавіруса, паведамляе газета The New York Times са спасылкай на менеджара па продажах галандскага кангламерату фларыстаў Royal Flora Holland Фрэда ван Тола. Вялікія фінансавыя страты церпяць не толькі вытворцы цюльпанаў і ўладальнікі кветкавых крам: краіна таксама пазбавілася шматлікіх турыстаў, якія ў гэтую пару года прыязджаюць паглядзець на адну з найпапулярнейшых славутасцяў Галандыі — палі цюльпанаў, нарцысаў і гіяцынтаў ў Лісе. Так, каралеўскі парк кветак у Нідэрландах «Кекенхоф» сёлета так і не адчыніў дзверы для наведвальнікаў, страты ацэньваюцца прыблізна ў 25 мільёнаў долараў.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 20073

КОРАТКА

• Беларусь завяршыла працэс ратыфікацыі пагадненняў з ЕС аб спрашчэнні выдачы віз і рэадмісіі.

• **Мітрапаліт Павел заклікаў вернікаў у гэтыя дні ўстрымацца ад наведвання храмаў.**

• МВФ прагназуе скарачэнне сусветнай эканомікі ў 2020 годзе на 3 %.

• **У Мінску пачалося будаўніцтва Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка.**

• «Купалле», «Дажынкі», «Гуканне вясны» — хусткі з унікальным дызайнам выпусцяць у Беларусі.



• **Спектакль-канцэрт Купалаўскага тэатра «Вельтмайстар-акардэон» пакажуць на ўвесь свет.**

• У жылых дамах і інтэрнатах з двума і больш паверхамі будуць усталёўвацца ліфты.

На слыху

**Алена БОГДАН:**

# «Мы прымаем усе меры, каб не дапусціць лавінападобнага росту захваральнасці»

**З моманту рэгістрацыі першага хворага ў Беларусі выяўлены 3281 выпадак COVID-19. З іх цяпер шпіталізаваны 2444 пацыенты. У астатніх захворванне працякае ў лёгкай форме і яны лечацца амбулаторна. 57 пацыентаў маюць патрэбу ў падтрымцы апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх, 33 хворыя памерлі. Прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя традыцыйна адказалі на самыя папулярныя пытанні, якія ім паступаюць ад грамадзян аб распаўсюджванні каранавіруснай інфекцыі, а таксама ўдзялілі ўвагу аспектам педыятрыі і гінекалогіі ва ўмовах эпідэміі.**

— У некаторых рэгіёнах лічбы інфіцыраваных меншыя, чым у Віцебску ці Мінску, але гэта не азначае, што там не трэба захоўваць меры прафілактыкі, — пачала **намеснік міністра аховы здароўя Алена Богдан.** — У Брэсцкай вобласці зарэгістравана 73 выпадкі, у Віцебскай — 848, Гомельскай — 106, Гродзенскай — 53, Мінску — 1691, Мінскай вобласці — 359, Магілёўскай — 151.

***— Ці будзе ў Беларусі выкарыстоўвацца эксперыментальнае лячэнне ад COVID-19 прэпаратам «Авіган»?***

— У цяперашні час «Белфармацыя» прапрацоўвае пытанне ўвозу ў Беларусь прэпарата «Авіган», які будзе закуплены за кошт спонсарскіх сродкаў. У найбліжэйшы час мы чакаем яго паступлення. Ён будзе размеркаваны прапарцыянальна колькасці пацыентаў ва ўсе стацыянарныя ўстановы краіны.

***— Калі ў Беларусі надыдзе пік па COVID-19?***

— На працягу некалькіх апошніх дзён у нас штодзённа рэгіструецца прыблізна аднолькавая колькасць выпадкаў — 340—360. Мы прагназуем, што такая сітуацыя захаваецца цягам двух-трох тыдняў. Мы прымаем усе меры, каб не дапусціць імклівага, лавінападобнага росту і прайсці паката гэты перыяд пад'ёму COVID-19.

***— Ці праўда, што людзі, якія рабілі прышчэпку ад туберкулёзу, працей пераносяць каранавірус ці ўвогуле не заражаюцца? Ці ёсць падобная статыстыка па людзях, прышчэпленых ад воспы і малярыі?***

— Вакцынацыя ад туберкулёзу як уплыў на COVID-19 сёння вельмі актыўна абмяркоўваецца ў навуковым асяроддзі, але дакладных звестак пра сувязь прышчэпкі БЦЖ з захваральнасцю на каранавірусную інфекцыю пакуль няма.

СТАР. 2

# «Разам мы можам зрабіць больш»

## Калідоры для людзей і тавараў

У інтарэсах ЕАЭС працягваецца транзіт праз Беларусь, на нашых граніцах з ЕС правяраюць усіх, хто ўязджае. «Гэта ў асноўным грузавікі, фуры. ***Мы правяраем кіроўцаў, прычым, вельмі жорстка.*** Мы вызначылі тры калідоры, па якіх рухаюцца гэтыя велікагрузы, што транспартуюць праз Беларусь у вашы дзяржавы тавары. Арганізавалі месцы стаянак і адпачынку для гэтых людзей з поўным кантролем за імі. Вызначылі месцы заправак для гэтых велікагрузаў», — паведаміў Прэзідэнт Беларусі і дадаў, што не было выпадкаў забароны ўезду грамадзянам іншых краін.

Аляксандр Лукашэнка мяркуе, што ў цяперашняй сітуацыі нейкі транспартны калідор паміж краінамі павінен захоўвацца не толькі ў Беларусі.

«Напрыклад, прапануецца ўстанавіць маршруты руху, на іх вызначыць асобныя пункты заправак аўтатранспарту і адпачынку кіроўцаў. У такіх пунктах увесці асаблівы рэжым санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. Напрыклад, як гэта зроблена ў Беларусі, — звярнуў увагу кіраўнік нашай краіны. — Гэтымі каналамі змогуць скарыстацца таксама нашы грамадзяне, якія вяртаюцца на Радзіму: ці ў Беларусь, ці ў Расію, ці ў Казахстан, ці ў Кыргызстан, ці ў Арменію. ***Беларусь дзейнічае адказна. Мы не закрылі граніцу і па меры магчымасці дапамагаем людзям вярнуцца дадому***».

## Ядро саюза

Ім, на думку нашага лідара, з'яўляюцца адзіныя правілы рэгулявання знешняга гандлю.

У выключных выпадках ад іх магчымыя адступленні, але ў цэлым ***трэба захаваць практыку ўзгодненых рашэнняў.*** Перш за ўсё гэта датычыцца задавальнення ўнутраных патрэб



Фота БелТА.

на тавары з павышаным попытам або тых, ад якіх залежаць жыццё і бяспека грамадзян.

Увесь свет зацікаўлены ў набыцці такіх тавараў, таму продаж іх у трэція краіны — добры бізнес. Але, як заўважае Аляксандр Лукашэнка, адной з мэт саюза з'яўляецца клопат аб узроўні і якасці жыцця грамадзян нашых краін. «Таму нават пры разглядзе пытанняў аказання гуманітарнай дапамогі трэцім краінам прапаную ўсё ж зыходзіць з прыярытэту задавальнення попыту на гэтыя тавары на ўнутраным рынку саюза», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Жыццё пасля пандэміі

Як ніколі цяпер высокая рызыка разбурэння асновы любой эканомікі — прамысловасці, яе вытворчых і кааперацыйных сувязяў. Па словах кіраўніка нашай краіны, у ЕАЭС на іх стварэнне патрацілі больш за шэсць гадоў, і работа да гэтага часу не завершана.

«Прычым паставіць усё, што зроблена, пад пагрозу можна нават несвядома з дапамогай папулярных сёння супрацьэпідэмічных мер. ***Як пасля перамогі над пандэміяй будзем аднаўляць патэнцыял, які маем, і тэхналагічныя ланцужкі?»*** — задаў пытанне калегам беларускі лідар.

Ён адзначыў, што шматлікія краіны Еўропы і ЗША сёння прымаюць меры эканамічнага аднаўлення.

***«Нават у забяспечаных краінах Еўрасаюза, асноўных краінах, з'яўляюцца сігналы голаду насельніцтва. Таму нам ні ў якім разе нельга, на маю думку, сёння рухацца шляхам, які прывядзе да разбурэння эканомікі»,*** — канстатаваў ён.

Сярод галоўнага, на што звярнуў увагу старшыня Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, — прыняцце дзейсных мер, накіраваных на рэальнае паглыбленне прамысловага супрацоўніцтва.

«Калі мы выкарыстоўваем у вытворчых працэсах сыравіну і матэрыялы адно аднаго, то такія аперацыі павінны ўзаемна прызнавацца пры субсідзіраванні канчатковай прадукцыі», — упэўнены беларускі лідар. Таму сёння як ніколі актуальна жорсткае даручэнне ўрадам укараніць адпаведныя нормы ў нацыянальныя заканадаўствы аб прамысловых субсідыях.

Акрамя таго, такое рашэнне будзе спрыяць зняццю наступнай праблемы: большасць міжнародных экспертаў сыходзіцца ў прагнозах аб надыходзячым недахопе харчавання пасля пандэміі. Маштабныя каранцінныя мерапрыемствы па ўсім свеце парушылі вытворчы цыкл вырошчвання сельгаспрадукцыі.

«Апошнім часам павышаны попыт на прадукты харчавання выразна паказаў, што гэтай тэмай трэба займацца на нашым вышэйшым узроўні. Прыняўшы своечасовыя рашэнні, ***мы зможам забяспечыць дастатковы аб'ём вытворчасці прадуктаў харчавання»,*** — звярнуўся да калег Аляксандр Лукашэнка.

## Пачаць з газу

Беларускі Прэзідэнт звярнуў увагу, што краіны ўвайшлі ў крызіс з нявырашаным базавым для ўстойлівай работы эканомікі пытаннем — гэта энергетыка, цэны на рэсурсы і разлікі за іх. Прадбачыць такую сітуацыю нельга было, але факт у наяўнасці. Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены, што такая нягнуткасць негатыўна ўплывае на ўвесь ланцужок фарміравання дабаўленай вартасці — а значыць, падрывае ўстойлівасць функцыянавання Саюза, асабліва ў перспектыве.

«Пакуль мы не выйшлі на агульныя энергетычныя рынкі ў ЕАЭС, нам трэба дамовіцца аб тым, як мы паступім у сітуацыі, якая складваецца. У першую чаргу гэта датычыцца цэн і разлікаў за газ. Відавочна, што пры такой рэзкай змене эканамічнай кан'юнктуры ***цана павінна быць больш адаптыўная, а механізм разлікаў — пад'ёмны для спажыўцоў»,*** — звярнуў увагу калег Аляксандр Лукашэнка.

Асобна ён звярнуўся да Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з прапановай аператыўна разгледзець гэтае пытанне.

## На перспектыву

Беларускі лідар заклікаў распачаць рашучыя дзеянні, разлічаныя не толькі на бягучае развіццё сітуацыі, але і на перспектыву, прадумаць фарміраванне ўласнага рэгіянальнага «пояса бяспекі» шляхам паскарэння стварэння імпартазамяшчальных вытворчасцяў і лакалізацыі на тэрыторыі саюза крытычна важных галін.

Акрамя таго, дзяржавам ЕАЭС патрэбныя агульныя механізмы рэагавання на глабальныя крызісы новага роду — эпідэмічныя, агульныя нормы і планы дзеянняў у надзвычайных сітуацыях у мэтах памяншэння рызык.

«У адным я перакананы цалкам: ***разам пераможаць гэты глабальны крызіс нам будзе лягчэй. Увогуле, іншага не дадзена, бо логіка любога саюза і ўзаемаадносін у гэтым саюзе прадугледжвае менавіта «разам». А яшчэ лепш — калі ўсе нашы дзеянні будуць пазбаўленыя нацыянальнага эгаізму*** і рашэнні будуць узгоднены з адзіным вектарам накіраванасці», — у духу сапраўднай інтэграцыі адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Поспех — у адзінстве

Падводзячы вынікі размовы, беларускі лідар паведаміў, што галоўная выснова сустрэчы — у неабходнасці аператыўнага прыняцця разлічаных на перспектыву стратэгічных рашэнняў. Яны дазволяць хутка аднавіцца пасля крызісу і вярнуцца на ўстойлівы шлях пабудовы эканамічнай прасторы ЕАЭС.

«Думаю, 19 мая (магчымая дата саміту ЕАЭС. — **«Зв.»**) мы больш паглыблена абмяркуем гэтыя пытанні нашай стратэгіі і аднаўлення нашага саюза, эканомікі, жыцця людзей пасля пандэміі. Наш саюз павінен быць здольны супрацьстаяць не толькі гэтым выклікам, але і іншым пагрозам. Я ўпэўнены, усе мы атрымаем добрыя ўрокі з сённяшняй сітуацыі, так званай пандэміі. ***Менавіта ў адзінстве — аснова агульнага поспеху ў любой няпростай сітуацыі. Мы гатовы працаваць разам для пераадолення ўсіх праблем і выклікаў, якія сёння стаяць перад намі»,*** — завяршыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён запрасіў сваіх калег у Мінск і падкрэсліў, што ўсім гарантуе бяспечнае знаходжанне ў беларускай сталіцы.

## Перавагі інтэграцыі

У Сумеснай заяве, дзе адлюстраваны вынікі сустрэчы, члены Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета пацвердзілі гатоўнасць да працягу згуртаванай работы для ліквідацыі негатыўных наступстваў пандэміі COVID-19, захавання дасягнутага ўзроўню інтэграцыйнага супрацоўніцтва і далейшага эканамічнага развіцця дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, забеспячэння сацыяльнай і макраэканамічнай стабільнасці ў нашых краінах, падтрымання дзелавой і інвестыцыйнай актыўнасці.

У тым ліку ў заяве падкрэсліваецца, што барацьба з пандэміяй COVID-19 не павінна прыводзіць да разрыву напрацаваных кааперацыйных сувязяў, прыпынення міжнароднага гандлю, спынення інвестыцыйнай дзейнасці.

У прыватнасці, урадам, цэнтральным (нацыянальным) банкам дзяржаў — членаў ЕАЭС і Еўразійскай эканамічнай камісіі даручана ажыццяўляць скаардынаваныя меры па прафілактыцы і прадухіленні распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі, умацаванні эканамічнага супрацоўніцтва, захаванні стабільнасці функцыянавання ўнутраных, у тым ліку харчовага, рынкаў, падтрымцы грамадзян і бізнесу для пераадолення негатыўных наступстваў пандэміі.

«Мы цвёрда ўпэўненыя ў тым, што перавагі інтэграцыі дапамогуць нашым краінам і народам годна справіцца з гэтым выпрабаваннем», — гаворыцца ў заяве.

**Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


БАНК РЕШЕНИЕ

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2020 г.**

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2020 | 01.01.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 9 318 | 7 748 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 13 440 | 15 300 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 17 719 | 16 949 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 27 171 | 21 915 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 148 577 | 127 225 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 460 | 460 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 19 523 | 19 415 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 459 | 541 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 712 | 1 712 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 179 | 179 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 6 444 | 6 419 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 245 002 | 217 863 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 7 400 | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 7 472 | 9 307 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 165 859 | 145 077 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 10 602 | 10 030 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 402 | 2 409 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 193 735 | 166 823 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 35 988 | 35 988 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 719 | 406 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 12 952 | 12 978 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 1 608 | 1 668 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 51 267 | 51 040 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 245 002 | 217 863 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2020 г.**

Наименование банка ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2020 | 01.04.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 4 305 | 3 221 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 915 | 1 333 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 390 | 1 888 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 728 | 1 643 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 744 | 569 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 984 | 1 074 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (34) | 7 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 408 | 343 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 2 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 1 315 | 331 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 411 | 295 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 3 423 | 2 843 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 148 | 113 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 273 | 322 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 46 | 58 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 227 | 264 |

Председатель Правления С.Д. Будников

Главный бухгалтер В.С. Боричевская

Дата подписания: 03 апреля 2020 г.

ЗАО «Банк «Решение» УНП 100789114. Лиц. № 14 от 08.06.2016 НБ РБ


# «Мы прымаем усе меры, каб не дапусціць лавінападобнага росту захваральнасці»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прышчэпкі ад малярыі не існуе ў прынцыпе. Вакцынацыя ад воспы ў Беларусі не праводзіцца пачынаючы з 70-х гадоў мінулага стагоддзя, таму дакладнай інфармацыі на гэты конт няма ні ў нас, ні за мяжой.

***— Ці ёсць статыстыка па курыльшчыках і ўплыве гэтай звычкі на цячэнне COVID-19?***

— Мы аналізуем кожны выпадак узнікнення каранавіруснай пнеўманіі, абавязкова ацэньваем хранічныя захворванні, якія ёсць у пацыентаў, бо COVID-19 істотна абцяжарвае цячэнне гэтых хвароб. Часта цяжкія хранічныя паталогіі настолькі дэкампенсуюцца, што становяцца прычынай смерці. Акрамя таго, сёння мы абавязкова аналізуем усе шкодныя звычкі, якія ёсць у пацыента, у тым ліку курэнне. Тая колькасць пацыентаў і назіранняў, якая ў нас пакуль ёсць, не дазваляе зрабіць якія-небудзь сур'ёзныя высновы. Але адназначна мы бачым цяжэйшае цячэнне хваробы ў пацыентаў, якія кураць.

***— Ці ёсць рэкамендацыі на перыяд рэлігійных свят да настаяцеляў храмаў і цэркваў?***

— Міністэрства аховы здароўя двойчы сустракалася з Мітрапалітам Паўлам і нашымі святарамі. **11 красавіка Мітрапаліт Павел падпісаў рэкамендацыі па правядзенні ўсіх велікодных мерапрыемстваў, каб мінімізаваць магчымасць заражэння і перадачы віруса ў прыхаджан. Першая і самая галоўная рэкамендацыя: людзям, якія маюць хранічныя захворванні ці прыкметы рэспіраторных інфекцый, неабходна застацца дома і не наведваць велікодныя набажэнствы. Усе абрады будуць максімальна вынесены на вуліцу, акрамя таго, шэраг рытуалаў будзе зменены, каб не дапусціць заражэння.**

***— Колькі ў краіне даступна апаратаў ШВЛ?***

— Мы неаднойчы давалі гэту інфармацыю — у нас больш за 2,2 тысячы апаратаў ШВЛ і 1,5 тысячы наркозна-дыхальных апаратаў. На сёння ўсяго 57 пацыентаў знаходзіцца на апаратах ШВЛ. Іх запас дастатковы. Таксама праводзіцца работа па падводцы дадатковых пунктаў падключэння кіслароду ў медустановах усіх рэгіёнаў краіны.

***— Ці аднаўляюцца лёгкія пасля каранавіруснай інфекцыі?***

— Каля 85 % пацыентаў пераносяць гэту інфекцыю бессімптомна і лёгка. І тое, што мы бачым у іх, — каранавірус не пакідае ніякага следу ў арганізме. Тым пацыентам, якія цяжка пераносяць каранавірусную інфекцыю, будуць праведзены рэабілітацыйныя мерапрыемствы, пачынаючы з этапу стацыянарнага лячэння. У цяперашні час падрыхтавана адна з нашых устаноў для правядзення ім стацыянарнай рэабілітацыі, калі гэта спатрэбіцца.

# СЁННЯ Ў МОДЗЕ ЗДАРОЎЕ

## По даручэнні кіраўніка дзяржавы Адміністрацыя Прэзідэнта вядзе маніторынг вытворчасці медыцынскіх сродкаў аховы



Фота БелТА.

**Учора кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА наведаў прадпрыемства «Элема». Вядомы брэнд жаночага адзення цалкам перайшоў на вытворчасць медыцынскіх сродкаў аховы, каб задавальняць патрэбы Мінска. Дарэчы, кіраўніцтва «Элемы» самастойна без указання прыняло рашэнне арганізаваць выпуск неабходнай прадукцыі з 3 красавіка, і прадпрыемства ўжо выходзіць на вытворчасць 50 тысяч масак і адной тысячы касцюмаў у дзень.**

«Па даручэнні кіраўніка дзяржавы Адміністрацыя Прэзідэнта арганізавала маніторынг сітуацыі ў лёгкай прамысловасці. Рэалізуюцца мерапрыемствы па кантролі вытворчасці медыцынскіх масак, камбінезонаў і касцюмаў, якія сёння так неабходныя медыцынскім работнікам», — перадае БелТА словы Ігара Сергеенкі.

Ён адзначыў, што кіраўніцтва прадпрыемства прыкладае ўсе намаганні, каб максімальна хутка, якасна выпускаць прадукцыю, забяспечваць ёю аптэкі і ўстановы аховы здароўя.

ААТ «Элема» вырабляе чатырохслаёвыя медыцынскія маскі, ахоўныя камбінезоны і халаты з беларускага спанбелу. Прадукцыя дзень у дзень размяркоўваецца па папярэдніх заяўках. У рабоце задзейнічаны чатыры швейныя цэхі і адзін раскройны.

# Дзеці пераносяць лёгка, але і іх трэба берагчы

**На пытанні па цяжарнасці, родах і педыятрыі адказалі галоўныя спецыялісты аддзела дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Людміла КЕДА і Таццяна БУРДЗЬ, а таксама ўрач—акушэр-гінеколаг, асістэнт кафедры грамадскага здароўя і аховы здароўя БелМАПА, кіраўнік праекта «Мама PRO» Дзіяна МАРДАС.**

***— Ці высокая рызыка заражэння цяжарных жанчын COVID-19?***

**Л. К.** — Эпідэміялагічны працэс распаўсюджвання захворвання ў розных краінах дэманструе, што ёсць павышаная рызыка захваральнасці і смяротнасці сярод пажылых людзей, пацыентаў з хранічнымі хваробамі, камарбіднымі станамі, павышана рызыка ў медыцынскіх работнікаў, якія аказваюць дапамогу пацыентам з COVID-19. Пераканаўчых звестак, што цяжарныя жанчыны маюць павышаныя рызыкі захваральнасці і смяротнасці, у цяперашні час няма. У любым выпадку кожная цяжарная жанчына павінна разглядацца як пацыентка высокай рызыкі, асабліва ў тэрмін цяжарнасці пасля 24 тыдняў, бо іх успрымальнасць да COVID-19 з-за зменена імуннага адказу можа быць вышэйшая, цячэнне хваробы цяжэйшае, а аказанне дапамогі пры ўзнікненні крытычнага стану больш працаёмкае.

***— Ці можна дзецям наведваць спартыўныя секцыі і гурткі? Ці патрэбна дзецям даведка ад урача для школы пасля канікул?***

**Т. Б.** — Медыцынскія даведкі не патрэбны, калі дзеці знаходзяцца на канікулах. Калі дзіця хварэла ў гэты перыяд, даведку дасць урач-педыятр па завяршэнні хваробы. Наконт секцый і гурткоў: усе нашы рэкамендацыі заснаваны на тым, што варта пазбягаць месцаў масавага збірання людзей, адпаведна, мы рэкамендуем устрымацца ад наведвання такіх заняткаў, а вырашаць бацькам.

***— Ці магу я вадзіць дзіця ў дзіцячы садок, калі наш бацька — кантакт першага ўзроўню?***

**Т. Б.** — Можаце вадзіць, бо ваш муж не хворы, пры ўмове, што ён выконвае патрабаванні самаізаляцыі.

***— Ці трэба цяпер наведваць жаночую кансультацыю цяжарным?***

**Л. К.** — Наведванне жаночай кансультацыі не адмяняецца, але ваш урач павінен скласці індывідуальны план вядзення цяжарнасці. Калі ў жанчыны ёсць істотныя паталогіі, колькасць наведванняў захоўваецца, калі яна здаровая, то прыходзіць да ўрача радзей.

**Д. М.** — Падрыхтоўка будучых мам пераведзена ў анлайн-рэжым. На сайце праекта «Мама PRO» ў нас больш за сем тысяч новых карыстальнікаў, адначасова там знаходзіцца 400 мам і тат. І гэта нас вельмі радуе.

***— Якія асаблівасці COVID-19 у дзяцей? Якія для іх меры прафілактыкі? Куды звяртацца, калі ў сям'і ёсць хворы на COVID-19?***

**Т. Б.** — Калі ў сям'і ёсць хворы, то дзіця — кантакт першага ўзроўню. Калі ў яго ёсць сімптомы хваробы — выклікайце хуткую дапамогу. Дзеці найчасцей пераносяць гэтую інфекцыю бессімптомна, цяжкіх формаў, як правіла, няма. На сёння з усіх інфіцыраваных у нас усяго 80 дзяцей. Стан іх характарызуецца субфебрыльнай тэмпературай, сустракаюцца млоснасць і рвота, часам боль у горле і кашаль. Меры прафілактыкі агульныя для ўсіх: навучыце дзіця рэспіраторнаму этыкету, каб яно карысталася аднаразовымі сурвэткамі, у грамадскіх месцах адзявала маску, мыла рукі, пазнаёмце з антысептыкамі, раскажыце, што трэба пазбягаць кантактаў з хворымі.

***— Пры якіх умовах шпіталізуюць дзяцей?***

**Т. Б.** — Калі яны маюць пацверджаны дыягназ, а таксама калі з'яўляюцца кантактамі першага і другога ўзроўню з сімптомамі ВРВІ. Такое дзіця можа знаходзіцца дома, калі створаны ўсе ўмовы для самаізаляцыі. Яны такія ж, як і для дарослых: асобнае памяшканне, асобны посуд і прадметы асабістай гігіены, а калі трэба пакінуць пакой ці кватэру, неабходна надзяваць маску і пальчаткі.

**А. Б.** — Мы прааналізавалі магчымасці і для дарослых хворых знаходзіцца дома, калі іх стан не выклікае апасенняў. Да іх будзе выязджаць брыгада медыкаў тры разы: на першы, сёмы і трынаццаты дзень. Спецыялісты абавязкова бяруць мазкі. Акрамя таго, штодзённа ўрач участковай службы тэлефануе пацыенту, цікавіцца станам яго здароўя і дае рэкамендацыі. У выпадку пагаршэння пацыент звязваецца з паліклінікай ці тэлефануе ў хуткую дапамогу і паведамляе, што ён хворы альбо кантакт першага ўзроўню. Яго шпіталізуюць у стацыянар для далейшага абследавання і лячэння.

**Алена КРАВЕЦ.**


И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Купала-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛОГО ДОМА**

***(составные части и принадлежности:*** *пристройка, два теневых навеса, погреб, сарай)* **общей площадью 63,5 кв. м с инв. № 630/С-78850, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623855700001000431 (право постоянного пользования) площадью 0,1450 га по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. п. Радошковичи, ул. Максима Горького, 27**. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, пл. 0,0029 га; охранная зона газопровода среднего давления, пл. 0,0002 га; охранная зона линии связи и радиофикации, пл. 0,0002 га.*

**Начальная цена** без НДС (20 %) – **998,64** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **99,86** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Аукцион состоится **18.05.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.05.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 207-71-34, 8 (029) 102-21-17.**



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронный торгов:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, пер. Восточный, 17

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46

**Адрес ЭТП:** www.ipmtorgi.by

**Предмет электронных торгов: недвижимое имущество, расположенное по адресу:** Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75–137

| Лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Магазин встроенный (административно-торговое помещение магазин встроенный)** | 368 кв. м | 240/D-36384 |

**Начальная цена с НДС 20 %: 206 400,00 белорусского рубля BYN**

**Недвижимое имущество, расположенное по адресу:** Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75–138

| Лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 2 | **Выставочный зал «Лань» расположен на 1–2 этаж (административно-торговое помещение выставочный зал «Лань»)** | 534,4 кв. м | 240/D-36385 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 295 200,00 белорусского рубля BYN**

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронный торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 30 (тридцать) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет электронных торгов с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата, место и время проведения электронных торгов:**
**Начало торгов – 11.00 18.05.2020 г. Окончание торгов – 12.00 18.05.2020 г.**
**Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов**

**Дата, место и время окончания приема документов:**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.05.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны** **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**



**ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,**

опубликованную в газете «Звязда» от 19 февраля 2020 года № 33(2947) по объекту

**«Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Л. Беды – ул. 1-я Поселковая – ул. Восточная – ул. 1-я Базисная в г. Минске» 1-я очередь. Жилой дом № 1 по генплану.**

Общество с ограниченной ответственностью «ТЕНКинвест» вносит изменения и дополнения в раздел «Информация об объекте строительства».

**Пункты «Цена квадратного метра» и «Количество объектов строительства для заключения договоров» изменить и изложить в следующей редакции:**

**«Цена одного квадратного метра:**

- общей площади жилых помещений, расположенных со второго по шестнадцатый этажи, с учетом лоджии составляет сумму в белорусских рублях эквивалентную **1 400 долларам США**.

- общей площади жилых помещений, расположенных на первом этаже, с учетом лоджии составляет сумму в белорусских рублях эквивалентную **2 000 долларам США**.

Подлежащая оплате сумма определяется по курсу белорусского рубля к доллару США, согласованному сторонами.

**Количество объектов строительства для заключения договоров – 110** единиц:

1-комнатные квартиры – 47 единиц;
2-комнатные квартиры – 47 единиц;
3-комнатные квартиры – 15 единиц;
4-комнатная квартира – 1 единица.»

Остальные разделы декларации остаются в прежней редакции.

УНП 191116618.

# «Ой, бярозы ды сосны, партызанскія сёстры...»

БЫЛА вясна ў самым разгары, у лесе з'явіліся дываны з пралесак. Аляксандр Кастрама прывёў мяне да месца, дзе калісьці дыслацыраваўся іх партызанскі атрад. Глядзячы на такую прыгажосць, я не мог уявіць, што калісь тут была вайна, пільнавала смерць і што гэтыя мясціны, як рэха, нагадвалі Аляксандру Якаўлевічу дні яго апаленай маладосці. Здымак у вясновым лесе — адзін з найлепшых у маёй скарбонцы пра тройчы ардэнаносцаў.

А вось сустрэча з Аляксандрам Малевічам адбылася восенню. Ён быў ужо не першы год на заслужаным адпачынку, але па-ранейшаму захоўваў мундзір лесніка, на якім красаваліся сведкі яго баявой маладосці — ордэны салдацкай Славы. Аляксандр Іванавіч сфатаграфаваўся з канём — коні былі яго захапленнем.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

**«Звязда» працягвае праект «Дарогамі Славы», які запусціла сумесна з Музеем гісторыі Узброеных Сіл. У межах праекта мы апавядаем пра ваенны шлях поўных кавалераў ордэна Славы, якія нарадзіліся ў Беларусі або звязалі з ёй свой далейшы лёс.**

**Заклікаем вас, паважаныя чытачы: калі сярод вашых родных і блізкіх хтосьці або быў поўным кавалерам ордэна Славы, або асабіста іх ведаў і захаваў успаміны ці фотаздымкі, то дзяліцеся вашымі гісторыямі з намі! Наш адрас — вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013. Адрас электроннай пошты — info@zviazda.by. Ніводны ліст не застанецца без увагі!**

**А пакуль згадваем жыццёвы і ваенны шлях яшчэ двух вайскоўцаў — хлопцаў, якія пачалі барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў яшчэ ў партызанах.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Аляксандр МАЛЕВІЧ

Ён нарадзіўся ў 1920 годзе ў мястэчку Ліпск, якое належала да Навагрудскага павета Мінскай губерні. Мясцовасць у гэты час акупавала польская армія; за Польшчай гэтыя землі і засталіся па ўмовах Рыжскага міру. Адукацыю, на жаль, наш герой атрымаў толькі пачатковую — сям'я Аляксандра Малевіча была шматдзетная, і трэба была зарабляць грошы.

Пасля таго як родную вёску акупавалі немцы, Аляксандр Малевіч у пачатку 1942 года пайшоў у партызаны. Быў спачатку сувязным у атрадзе, пасля — байцом. Павестка ў ваенкамат прыйшла Аляксандру Малевічу неўзабаве пасля вызвалення Ляхавіччыны, куды Ліпск увайшоў незадоўга да вайны. Пасля вучобы ў стралковым палку трапіў у студзені 1945 года ў 642-і стралковы полк 200-й Дзвінскай стралковай дывізіі 2-га Беларускага фронту. Паступова дзякуючы заслугам дайшоў да камандзіра стралковага аддзялення.

У сакавіку 1945 года падчас Усходне-Памеранскай наступальнай аперацыі пачалося імклівае наступленне на Данцыгска-Гдыньскі абаронны пояс, створаны немцамі. Перад 2-м Беларускім фронтам камандаванне паставіла задачу ачысціць ад праціўніка ўсё ўзбярэжжа Балтыкі — ад Одэра да Віслы. Нацысты, у сваю чаргу, сканцэнтравалі там вялікую ўдарную групоўку з сіл групы армій «Вісла». Яны ставілі мэтай разгром падрыхтоўкі савецкага наступу на Берлін.

З сакавіка магутныя баі ішлі за вёску Кедровіцэ. Пасля таго як са строю выбыў камандзір аддзялення, Аляксандр Малевіч прыняў кіраванне на сябе. Быў паранены, але поле бою не пакінуў. Дзякуючы гэтаму пастаўленая задача была выканана, за што 25-гадовы хлопец быў прадстаўлены да ордэна Славы III ступені.

| 4 | Остаток на 1 января 2019 г. | 3011 | 35988 | - | 208 | 1424 | 13057 | 50677 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 198 | 244 | (79) | 363 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 363 | - | 363 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 198 | (198) | - | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | - | x | x | - |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 5.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 79 | (79) | - |
| 5.9 | прочие изменения (округления) | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2020 г. | 3013 | 35988 | - | 406 | 1668 | 12978 | 51040 |

## СВЕДЕНИЯ
## о совокупном доходе
## за 2019 год

Наименование банка: ЗАО «Банк Решение» *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 16 | 363 | 197 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | - | - |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств и прочего имущества | 3012121 | | - | - |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | 16 | 363 | 197 |

## Отчет о движении денежных средств
## за 2019 год

Наименование банка: ЗАО «Банк Решение» *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2019 г. | 2018 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 14 058 | 12 628 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (6 300) | (4 910) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 8 347 | 6 704 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (2 948) | (2 139) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | 127 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 30 | 7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 1 856 | 2 378 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 5 | 29 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 1 946 | 1 690 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (12 044) | (11 945) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (120) | (299) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | 23 | 4 830 | 4 270 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (336) | (282) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 13 322 | (14 669) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (21 658) | - |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (20 054) | (11 875) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 7 | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (2 786) | 333 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | 23 | (31 505) | (26 493) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 8 864 | (9 530) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 24 876 | 18 716 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка | 70303 | | 521 | 2 774 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 834 | (144) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | 23 | 35 095 | 11 816 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | 23 | 8 420 | (10 407) |
| 29 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (1 285) | (1 439) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 881 | 737 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | (157 680) | (39 126) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 157 680 | 44 999 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | 23 | (404) | 5 171 |
| 37 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | 4 182 |
| 39 | Выкуп акций собственной эмиссии | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 72104 | | - | - |
| 43 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | 23 | - | 4 182 |
| 44 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | 23 | (379) | 302 |
| 45 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 7 637 | (752) |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 23 | x | 26 447 |
| 47 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 23 | 34 084 | x |

Председатель Правления С.Д. Будников

Главный бухгалтер В.С. Боричевская

Дата подписания: 9 марта 2020 г.

ЗАО «Банк «Решение», УНП 100789114. Лиц. № 14 от 08.06.2016 НБ РБ

Исх. № 05-01/19 от 09 марта 2020 г.

**АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ГОДОВОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ**

**Господину Будникову Сергею Дмитриевичу,**
Председателю Правления ЗАО «Банк «Решение».

**Акционерам, Наблюдательному Совету и Правлению**
ЗАО «Банк «Решение».

**ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ГОДОВОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ**

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее – годовая финансовая отчетность) закрытого акционерного общества «Банк «Решение» (далее – ЗАО «Банк «Решение», Банк) (Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул. В.И. Игнатенко, 11, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100789114) состоящей из бухгалтерского баланса на 01 января 2020 года, отчета о прибылях и убытках; отчета об изменении собственного капитала; отчета о движении денежных средств за 2019 год, примечаний к годовой финансовой отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, прилагаемая годовая финансовая отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАО «Банк «Решение» по состоянию на 01 января 2020 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2019 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита годовой финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте аудита годовой финансовой отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этих вопросах.

Статья «Кредиты клиентам» бухгалтерского баланса

В связи со значимостью кредитов клиентам, а также в связи с присущей им неопределенностью их погашения расчет резерва на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе, считается одним из ключевых вопросов аудита.

Существенные суждения необходимы для классификации активов, подверженных кредитному риску и оценки способности кредитополучателя исполнить свои обязательства перед Банком, включая оценку качества и достаточности обеспечения.

В основу классификации кредитной задолженности по группам риска положены требования Инструкции о порядке формирования и использования банками, открытым акционерным обществом «Банк развития» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе от 28.09.2006 № 138.

Примечание 3 «Кредиты клиентам», включенное в годовую финансовую отчетность, содержит информацию о сформированных резервах на покрытие возможных убытков по кредитам. Примечание 21 «Управление банковскими рисками» содержит информацию о предоставленном кредитополучателями обеспечении, снижающем уровень кредитного риска.

В ходе наших аудиторских процедур мы рассмотрели и оценили методологию Банка, используемую при классификации кредитной задолженности по группам риска.

Выполненные нами аудиторские процедуры также включали проверку на выборочной основе своевременности выявления признаков негативной информации и финансовой неустойчивости кредитополучателей.

Мы протестировали (на выборочной основе) оценку способности кредитополучателей исполнить свои обязательства перед Банком, а также оценку качества и достаточности обеспечения.

Мы протестировали (на выборочной основе) достоверность проведенной Банком классификации кредитной задолженности по группам риска, полноту и своевременность формирования резервов на покрытие возможных убытков по кредитам и сформировали свое собственное суждение в отношении того, является ли такая классификация надлежащей.

Мы также проанализировали соответствие информации в отношении резерва на покрытие возможных убытков по активам, раскрываемой в годовой финансовой отчетности, применимым требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности.

**Прочие вопросы**

Аудит годовой финансовой отчетности ЗАО «Банк «Решение» за 2018 год был проведен другой аудиторской организацией, которая выразила немодифицированное аудиторское мнение о данной отчетности в аудиторском заключении от 21 февраля 2019 года.

**Обязанности аудируемого лица по подготовке годовой финансовой отчетности**

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки годовой финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в годовой финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки годовой финансовой отчетности аудируемого лица.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей годовой финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения годовой финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений годовой финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в годовой финансовой отчетности;

- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в годовой финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

- оцениваем общее представление годовой финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли годовая финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

***ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ОТДЕЛЬНЫМ ПРОВЕРЯЕМЫМ ВОПРОСАМ***

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала и величины левереджа», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» и 2809 «Расчет ликвидности» по состоянию на 01 января 2020 года, составленной ЗАО «Банк «Решение» в соответствии с требованиями Национального банка Республики Беларусь. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство ЗАО «Банк «Решение». В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, пруденциальная отчетность по формам 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала и величины левереджа», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности» по состоянию на 01 января 2020 года составлены во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками, открытым акционерным обществом «Банк развития Республики Беларусь» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 (с учетом дополнений и изменений).

Директор ООО «ФБК-Бел» А. Г. Ренейский

Аудитор, возглавлявший аудит И. Н. Федорова

**Информация об аудиторской организации:**

Общество с ограниченной ответственностью «ФБК-Бел» (ООО «ФБК-Бел»).
Место нахождения: Республика Беларусь, 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22А, пом. 201.
Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Минским горисполкомом 06 февраля 2009 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690398039.
УНП 690398039.

Дата подписания аудиторского заключения: 09 марта 2020 года.

# ШАНАВАЦЬ ПРОСТЫЯ РЭЧЫ

*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.*

— Смачны хлеб пачаўся з нясмачнага, куплёнага, які надта хутка псаваўся, — дзеліцца сваёй матывацыяй Вольга. — Аднойчы знаёмая прынесла мне закваску для хлеба. Прычым нічога пра выпяканне з яе не расказала. Інтарэс ахапіў мяне. Пачала шмат чытаць пра хлеб на заквасцы. Зразумела, што я, юрыст, які ніколі нічога не пёк, упершыню магу ўзяцца за справу, дзе рэальна ўбачу вынік цеплыні ўласных далоняў, прыроднай душэўнай чуласці, пазітыўнага характару. Праўда, атрымаўся «інтуітыўны хлеб», і вынік быў не заўсёды стабільны.

Сужэнец Вольгі Вячаслаў глядзеў на «хлебнае шаманства», а сам шукаў у сеціве для жонкі школу хлебапёкаў. Знайшоў міжнародную анлайн-школу хлеба на заквасцы, заснаваную маскоўскай сямейнай парай. Вольга пачала браць урокі. Зацягнула. Яна кажа: хруст скарынкі першага ўдалага дамашняга бохана, нібы рубільнік, нешта пераключыў у душы. Вольга больш не вярнулася да юрыдычнай практыкі:

— Аказалася, што самае складанае ў прыгатаванні хлеба — стрымаць сябе чатыры гадзіны і не адламіць кавалачак. Ёсць нават такая французская прымаўка: сапраўдны джэнтльмен пакідае даме скарыначку. Так, немагчыма ўстаяць перад пахам, перад выглядам скарынкі. Вось такі вынік проста ад таго, што прыручыў у сваіх руках муку ды ваду.

Хлебапёк расказвае, што працэс атрымання самой закваскі можа займаць да сямі дзён. Потым яе захоўваюць у слоіку і толькі падкормліваюць:

— Закваска ў нашай сям'і — хатні гадаванец. Яе падкормка вельмі дысцыплінуе ўсіх членаў маёй сям'і, бо гэта ж жывы арганізм! З маленькай кроплі нараджаецца сіла, якая дае хлебу рост і той самы смак. Закваска корміцца штодзень. Усё па грамах трэба ўзважыць, каб не перакарміць і не пакінуць яе «галоднай».

**«Аказалася, што самае складанае ў прыгатаванні хлеба — стрымаць сябе чатыры гадзіны і не адламіць кавалачак. Ёсць нават такая французская прымаўка: сапраўдны джэнтльмен пакідае даме скарыначку. Так, немагчыма ўстаяць перад пахам, перад выглядам скарынкі. Вось такі вынік проста ад таго, што прыручыў у сваіх руках муку ды ваду».**





У Вольгі жытняя і пшанічная закваскі. Яна тлумачыць, як пачынаецца працэс:

— На саміх зярнятках ёсць мікраарганізмы. Вось з іх робіцца мука і змешваецца проста з вадой. У цяпле ўсё закісае, ідзе рост дзікіх дражджэй і малочнакіслых бактэрый. Закваска расце пяць-восем гадзін, потым ставім рошчыну — дадаём ваду і муку. На рошчыне замешваем цеста, якое пакідаем расстойвацца для далейшага закісання.

Прыгатаванне хлеба займае ў залежнасці ад гатунку ад 12 гадзін да сутак. У гэтым, як сцвярджаюць прафесіяналы, і ёсць уся «соль»: працэсы закісання ўжо скончаны, і такі хлеб больш карысны для страўніка чалавека. Яшчэ ён ніколі не пакрыецца цвіллю.

— Працэс працяглы, але ў гэтым і асалода сакральнага хлебнага дзейства, — дзеліцца ўражаннямі Вольга. — Вучышся адчуваць хлеб: як ён дыхае, рэагуе. Добры натуральны хлеб — гэта пра стасункі і энергетычны ўзаемаабмен.

Дарэчы, свае хлебныя пачастункі Вольга выпякае ў звычайнай духоўцы. Яна здолела цалкам змяніць гастранамічныя прыхільнасці сваіх дамачадцаў у дачыненні да крамнай выпечкі. А яшчэ парада ўсім матулям: менавіта хатні хлеб заклаў у сям'і Бахметавых добрую традыцыю снедаць і вячэраць разам — без гаджэтаў і прагляду тэлевізара.

— Калі ты пачынаеш вучыцца пячы хлеб, то, здаецца, разам з закваскай расцеш і ты сам. Добры хлеб змяняе чалавека нават вонкава, — для Вольгі выпяканне дамашняга хлеба не бізнес, а хучэй падпрацоўка. — Працэс займае даволі шмат часу. Каб пячы хлеб у вялікіх аб'ёмах, трэба толькі гэтым і займацца. У мяне ёсць некалькі кліентаў, але я не стаўлю гэта, так бы мовіць, на вытворчую лінію. Я пяку ў сярэднім 15 боханаў некалькі разоў на тыдзень.

Яна прайшла ў хлебнай гісторыі ўсе этапы: пякла, каб адказаць на ўласны выклік, потым — для сваёй сям'і, вырабляла хлеб на продаж, ладзіла майстар-класы па выпяканні. Цяпер яе поўнасцю паглынула выкладанне хлебапякарскай справы. Яе і вучняў пах самаробнага хлеба яднае нават праз тысячы кіламетраў. Вольга як куратар міжнароднай школы праводзіць урокі для жыхароў розных куткоў свету. Дарэчы, падтрымка анлайн на ўсіх этапах стварэння хлеба — 24 гадзіны ўсе сем дзён на тыдзень.

— Я кажу, што праз хлеб у маё жыццё прыйшло вельмі шмат людзей. Гэта сотні розных гісторый, лёсаў. Гэта асэнсаванне, што перад мукой і вадой усе роўныя — багатыя ці бедныя. Не важна і тое, хто на якой мове размаўляе і дзе жыве. Усе вучацца шанаваць простыя рэчы ў сваім жыцці.

У жыцці Вольгі Бахметавай на самым пачатку яе хлебнага шляху таксама адбылася цікавая гісторыя, якая надала сілы рухацца да мэты.

— «Хлебныя карані», як я кажу, толькі пачалі прарастаць у глыб маёй душы, — дзеліцца Вольга. — Я марыла пабываць на майстар-класе амерыканскага хлебапёка Джэфры Хамельмана. Яго ў свеце лічаць хлебным гуру. Ён прыехаў у Санкт-Пецярбург. Я звязалася з арганізатарамі сустрэчы. Адказалі, што са ста чалавек на майстар-клас адабрана толькі дзесяць. Я вырашыла, што ўсё роўна паеду — дачакаюся зорку каля дзвярэй залы, дзе праходзіць навучанне вырабу хлеба.

Вольга так і зрабіла, а калі пабачыла амерыканца, працягнула кнігу майстра для яго аўтографа і выдала сваю гісторыю захаплення хлебам.

— Гуру аказаўся простым у стасунках чалавекам. Ён так расчуліўся, пачуўшы адкуль я прыехала да яго, што загадаў наступным разам уключыць мяне ў спіс удзельнікаў яго майстар-класа. Так, са мной звязаліся потым, але папярэдзілі, што кошт навучання — 800 долараў. Я адмовілася, бо грошай зусім не было. Аднак мне праз нейкі час зноў патэлефанавалі і даслалі бясплатнае імянное запрашэнне ад Джэфры Хамельмана. Ён мяне памятаў увесь гэты час.

Дарэчы, цяпер акрамя выкладання хлебапякарскай справы на міжнародных анлайн курсах Вольга Бахметава — выхаванка гомельскай школы «Сацыяльны прадпрымальнік». Не так даўно яна стала фіналісткай конкурсу найлепшых бізнес-ідэй сярод самазанятых гамяльчан.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з сямейнага архіва Бахметавых.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## КОЛЬКІ ТРЭБА ВАДЫ І ЎГНАЕННЯЎ НА КОЖНАЕ ДРЭВА

**Палівы і падкормкі звязаныя паміж сабой. Самае эфектыўнае ўнясенне ўгнаенняў — разам з паліўнай вадой. Таму падкормкі ўносяць ці перад палівам, ці глыбока закопваюць угнаенні ў глебу, каб прадухіліць выветрыванне азоту.**



Спяшацца з першай падкормкай не варта: трэба дачакацца, пакуль саспее глеба, каб можна было без праблем заладзіць угнаенні ў зямлю. Звычайна першую падкормку праводзяць у пачатку — канцы красавіка, трацячы на кожнае дрэва да 150—200 г мачавіны ці да 200–250 г аміячнай салетры. Гэта максімальная мера, а так падкормка разлічваецца з 20 г на кожны год. Гэта значыць, што калі дрэву ўсяго пяць гадоў, то доза будзе 100 г на дрэва, а калі яно мае 30 гадоў, тады бяром усе 150—200 г мачавіны.

Угнаенне раўнамерна рассыпаюць па праекцыі кроны і закопваюць у глебу перакопкай на глыбіню 10–15 см або раствараюць у вадзе і паліваюць з палівачкі пад кронай дрэва. Пасля гэтага можна правесці шчодры паліў саду.

Цікава, што ў засушлівую вясну рэкамендуецца ўносіць па 1 л 9-працэнтнага воцату на кожныя 50 л паліўной вады. Так расліны лепш пераносяць засуху. Але на кіслых глебах гэты прыём процідпаказаны. Грушы і яблыні маюць патрэбу ў вялікай колькасці вады — іх паліваюць не радзей чым раз на месяц.

Суніцы і клубніцы маюць асаблівую патрэбу ў паліве пасля пачатку цвіцення. Іх паліваюць два-тры разы на тыдзень, кожныя два тыдні праводзячы падкормку — па 15–20 г нітрафоскі на пагонны метр міжраддзяў.

Калі дрэвы адцвілі, трэба прадухіліць лішняе абсыпанне завязі. Для гэтага на перыферыі кроны капаем кольца глыбінёй да 10 см і шырынёй да 50 см. Раствараем у вядры вады (10 л) 30 г нітрафоскі, на кожнае дрэва бяром па 20 л такой вады за кожны год узросту дрэва (але не больш за 100 л) і паліваем гэтым аб'ёмам. Пасля паліву баразёнку можна зараўняць зямлёй.

Важна: вада павінна быць прагрэтая, вясной гэта мае значэнне. Летам, калі глеба гарачая, за гэтым ужо можна не сачыць.

Яшчэ адну падкормку праводзяць у канцы чэрвеня. Дрэвы ў гэты час расходуюць велізарную колькасць пажыўных рэчываў на рост завязяў. Падкормка неабходная ў тым ліку і для росту парасткаў. Таму для яе выкарыстоўваем дзіамафоску, якая змяшчае і азот, і падвышаную колькасць фосфару і калію. Дазіроўка 25 г на кожны год жыцця дрэва, але не больш за 250 г на дрэва. Праз месяц праводзяць яшчэ адну падкормку, для якой бяруць суперфасфат і сернакіслы калій, па 25 і 20 г адпаведна на кожны год жыцця дрэва, але не больш за 250 г суперфасфату і 200 г сернакіслага калію.

І не грэбуйце палівамі. Хоць у другую палову лета паліваць сад трэба радзей, але ўсё роўна трэба. Вельмі карысна сумяшчаць падкормкі з палівамі — і тады затраты на ўнясенне ўгнаенняў з лішкам акупяцца прыбаўкай ураджаю.

## КАБ ЦЫБУЛЯ НЕ ПАЙШЛА Ў СТРЭЛКУ

**Каб цыбуля не стралкавалася, неабходна адказна падысці не толькі да замочвання пасадачнага матэрыялу, але і да яго адбору, прасушвання і прагравання.**

Такім чынам, у першую чаргу трэба перабраць цыбулю і выдаліць няякасныя (падгнілыя), далей — пасартаваць пасадачны матэрыял па памерах (буйныя, сярэднія, дробныя). Нельга ў адзін час і для адной мэты саджаць буйныя і дробныя цыбуліны, бо хуткасць іх прарастання розная. Вялікія прарастаюць хутчэй, таму іх варта саджаць на «пяро», сярэднім і дробным трэба даўжэйшы час, яны лепш падыходзяць для вырошчвання на «рэпку».

Пасля сартавання пасадачны матэрыял трэба прасушыць і прагрэць. Сушыць цыбулю лепш у цёплым памяшканні без скразнякоў. Ідэальнае месца — гарышча, аднак і верхнія паліцы шафак на кухні выдатна падыходзяць для прасушкі. Пасля цыбулю трэба прагрэць — напрыклад, яе можна дзён на 10–15 раскласці на падаконніку пад прамымі прамянямі сонца альбо скласці ў скрынку і паставіць на батарэю.

Цяпер раскажам пра замочванне. Лічыцца, што замачыць цыбулю ў растворы соды — гэта найлепшы спосаб прадухіліць яе стралкаванне ў далейшым. Аднак варта адзначыць, што адно толькі замочванне без выканання правіл, якія апісаны вышэй, наўрад ці дазволіць цалкам пазбавіцца ад стралкавання.

Усё павінна быць у комплексе. Усяго 15 хвілін вытрымкі цыбулін у растворы соды (чайная лыжка на літр цёплай вады) напалову зніжаюць стралкаванне ў далейшым. А наогул памятайце: чым меншыя па памеры цыбуліны для пасадкі, тым меншая імавернасць, што цыбуля сыдзе ў стрэлку. Аднак варта ўлічыць, што дробныя цыбуліны вельмі доўга прарастаюць, а памеры ўраджаю (цыбуля-рэпка) не заўсёды радуюць.

Спытайце пра радзіннае

# Што рабілі з чырвонымі яйкамі?

**Пытанне з Віцебска ад Таццяны Ягоравай: «Традыцыйна на Вялікдзень людзі фарбуюць яйкі. А што прыхавана за гэтым святочным атрыбутам з пункту гледжання традыцыйнай культуры?»**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мы ўжо неаднаразова адзначалі, што фактычна кожны прадмет, які быў выкарыстаны ў абрадзе, атрымліваў статус рытуальнага атрыбута і пасля завяршэння абрадавых дзеянняў набываў у вачах людзей здольнасць спрыяць урадлівасці зямлі і паляпшэнню дабрабыту, перамагаць хваробы, прыварожваць каханага, засцерагчы чалавека ад кепскага ўздзеяння зайздросных людзей. Звычайнае белае курынае яйка, якое для вясковага люду было ў другой палове мінулага стагоддзя стравай паўсядзённага харчавання, у шэрагу выпадкаў таксама становілася атрыбутам побытавай магіі вясковай гаспадыні. Трэба было дакладна ведаць, калі іх збіраць (толькі да заходу сонца), у які час садзіць на яйкі курыцу-квахтуху (на маладзіковай фазе Месяца), у які дзень тыдня (у жаночыя дні, каб было больш курачак, чым пеўнікаў) і г. д. Зразумела, што зусім іншым магічна-прадуцыравальным статусам надзялялася чырвонае велікоднае яйка, ды яшчэ асвечанае ў царкве.

Мы ўжо пісалі, што покуць у хаце выконвала ролю сямейнага храма, у якім або разам з якім дамачадцы пражывалі год сонечнага колазвароту. Вялікдзень станавіўся сведчаннем таго, што навакольны свет ужо ўпарадкаваны і адлюстраваны ў знакавай сістэме покуці: пасля вяртання з храма маці-гаспадыня адно асвечанае яйка абавязкова клала ў покуць. На працягу ўсяго года яно выконвала ролю надзейнага абярэга ад хвароб дамачадцаў, ад сварак у хаце, ад штукарстваў дамавіка, ад маланкі і пажару. Такое яйка магло ляжаць некалькі гадоў і не псавалася (у якасці абрадавага эквіваленту маглі захоўваць шалупінне ад першага з'едзенага яйка).

У абрадах беларусаў яйка-абярэг выконвала яшчэ і прадуцыравальную функцыю. Асабліва выразна яна прасочвалася ў абрадах сельскагаспадарчай і жывёлагадоўчай накіраванасці. Адно велікоднае яйка пакідалі для асвячэння збожжа ў час засевак. Яго клалі ў зерне ў тую сявеньку, з якой звычайна гаспадар выконваў самае першае засяванне. Яйкі чырвонага або зялёнага колеру шматразова выкарыстоўваліся ў абрадах першага выгану жывёлы ў поле і пры абыходзе статка пастухамі. У асобных мясцінах для першага выгану жывёлы яйкі фарбавалі менавіта на Юр'я. Іх варылі ў вадзе разам з галінкамі і лісцем бярозы, таму яны былі зялёнага колеру.

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК.**

*Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый ды абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».*

## Даты | Падзеі | Людзі

**15 КРАСАВІКА**

У краіне

**1915** год — нарадзіўся (цяперашні Мсціслаўскі раён) Іван Кірылавіч Вальваценка, Герой Савецкага Саюза (1944). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941-га. Удзельнік абароны Львова, Ленінграда, Масквы, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Берлінскай і Пражскай аперацый 1945-га.



**1920** год — нарадзіўся Мікола Ракітны (Мікалай Ісакавіч Новікаў), беларускі пісьменнік. Працаваў у газеце «Звязда», часопісе «Беларусь». Аўтар празаічных зборнікаў «Ранняй вясною», «Вячэрнія зоры», «Селькоры», «Была вясна...» і іншых.

**1930** год — нарадзіўся Расціслаў Пятровіч Платонаў, беларускі гісторык, публіцыст, доктар гістарычных навук (1982), прафесар (1984). Адзін з аўтараў калектыўных прац «Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944)», «Станаўленне і крушэнне аднапартыйнай сістэмы ў СССР, 1917–1991» і іншых.

**1945** год — нарадзіўся Валерый Станіслававіч Пілатовіч, беларускі вучоны ў галіне нефралогіі і транспланталогіі, доктар медыцынскіх навук (1986), прафесар (2000). Аўтар навуковых прац па лячэнні хворых з ныральнай недастатковасцю, дыялізе і трансплантацыі ныркі, уралогіі.

**1950** год — нарадзілася Аляксандра Барысаўна Самаль, беларускі вучоны ў галіне біяфізікі, кандыдат біялагічных навук (1984). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000).

У свеце

**1452** год — нарадзіўся Леанарда да Вінчы, геніяльны італьянскі мастак, скульптар, архітэктар, вучоны, вынаходнік, пісьменнік, музыкант.



**1850** год — у Санкт-Пецярбургу была адкрыта лякарня Святога Лазара (Максіміліянаўская лякарня) — першая ў Расіі медыцынская ўстанова паліклінічнага тыпу.

**1935** год — у Вашынгтоне падпісаны Дагавор аб міжнародных нормах аховы культурных каштоўнасцяў (Пакт Рэрыха) — першы ў гісторыі міжнародны дагавор, які абвясціў абарону мастацкіх і навуковых устаноў і гістарычных помнікаў.

**1975** год — акадэмік Барыс Пятроўскі зрабіў першую хірургічную аперацыю ў баракамеры НДІ клінічнай і эксперыментальнай хірургіі Міністэрства аховы здароўя СССР.

Так гаварыў...

**ЛЕЎ ТАЛСТОЙ:**
*«Выхавацелю трэба глыбока ведаць жыццё, каб да яго рыхтаваць».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.08 | 20.12 | 14.04 |
| Віцебск — | 5.55 | 20.05 | 14.10 |
| Магілёў — | 5.58 | 20.02 | 14.04 |
| Гомель — | 5.58 | 19.55 | 13.57 |
| Гродна — | 6.24 | 20.26 | 14.02 |
| Брэст — | 6.27 | 20.24 | 13.57 |

**Месяц**

***Апошняя квадра ў 1.55. Месяц у сузор'і Вадаліва.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Палікарпа, Ціта.*
***К.*** *Анастасіі, Базыля, Вацлава, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Вы чаму пабілі мужа?
— Я яго не біла! Я хацела да яго дастукацца!

**— У вас такі шыкоўны макіяж! Вам пад ім не горача?**

— Віталь, я падобная на моль?
— Ну што ты, Юля!
— А чаму ў мяне ўсе думкі толькі пра футра?

**На прыёме ў псіхолага:**
**— Такім чынам, вам трэба напісаць пісьмо чалавеку, які вас злуе, і спаліць яго!**
**— Гэта зразумела! А з пісьмом што рабіць?**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1284.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 красавіка 2020 года.